# Характарыстыка літаратурнага музея Ф.К. Багушэвіча, размешчанага ў памяшканні дзяржаўнай установы адукацыі “Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча”

Літаратурны музей Ф.К. Багушэвіча створаны ў 1970 годзе па ініцыятыве былога дырэктара школы Крайнова Міхаіла Іосіфавіча і настаўніка беларускай мовы і літаратуры Кадыркі Канстанціна Аляксеевіча.

Кіраўніком літаратурнага музея з’яўляецца Лукша Галіна Браніславаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры.

Кожны год з вучняў 7-11 класаў ствараецца савет музея і лектарская група, якія складаюць актыў музея.

**Экспазіцыя музея складаецца з наступных раздзелаў:**

1. Дзяцінства і юнацтва. Свіраны. Кушляны;
2. Гады вучобы. Вільня. Пецярбург. Доцішкі;
3. Удзел у паўстанні. Аўгустоўская пушча;
4. У выгнанні;
5. Мужыцкі адвакат;
6. Першая кніга – “Дудка беларуская”;
7. “Смык беларускі”;
8. Апошнія гады жыцця. Кушляны. Жупраны.

У плане работы музея, які састаўляецца на навучальны год, адлюстроўваецца раздзелы:

- пошукава- даследчая работа;
- правядзенне экскурсій;
- правядзенне конкурсаў;
- выкарыстанне матэрыялаў музея ў вучэбна выхаваўчай рабоце школы;